ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 25 (1294) | НЯДЗЕЛЯ, 1-га лютага 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Комсамол—шэф электрофікацыі...
..ЯК АЖЫЦЬЦЁВІЦЬ ГЭТАЕ ШЭФСТВА?

З мэтай абгаварыць конкрэтныя формы працы комсамолу па ажыцьцяўленьню шэфства над электрофікацыяй, ЦК ЛКСМБ і рэдакцыя „Чырвонай Зьмены" склікаюць сёньня а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦК ЛКСМБ паўторную нараду па гэтаму пытаньню.

На нараду выклікаюцца—дырэктар, сэкратар ячэйкі КП(б)Б і бюро ячэйкі КСМ—ВЭО і СЭО і тэхнікі гэтых устаноў; прадстаўнікі Дзяржпляну, Эльводу, торфааб'яднаньня, электро-сэкцыі ВСНГБ, ЦП мэталістых, гарнякоў і гаркому комсамолу; прадстаўнікі колектываў заводаў „Энэргія", „Комунар", „Бальшавік", чыгунка, „Акцябрь", друкарні Сталіна і ўсіх тых прадпрыемстваў, пры якіх існуюць электростанцыі. Запрашаюцца спэцыялістыя. Яўка выкліканых абавязкова.

ЦК ЛКСМБ, „Чырв. Зьмена".

Барацьба за сьцягі—барацьба за трэці рашаючы

ЗА ТЭМПЫ ПЛЮС ЯКАСЬЦЬ

Мы ўступілі ў апошні пэрыод нэпу—у пэрыод соцыялізму. Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі, дабілася нябачаных у гісторыі дасягненьняў, пасьпяхова завяршае пабудову фундамэнту соцыялістычнай экономікі, выконвае плян вялікіх работ соцыялістычнага будаўніцтва—5—годку ў 4 гады.

У выніку гэтай творчай працы, энтузіязму рабочае клясы, на аснове генэральнай лініі партыі, карэнным чынам зьмянілася экономіка нашай краіны, зьмяніліся адносіны людзей да вытворчасьці, „праца з ганебнага і цяжкога ярма, якою яна лічылася раней, ператварылася ў справу гонару, у справу славы, у справу мужнасьці і гэройства" (Сталін).

Сёньня мы зьмяшчаем пастанову конкурснай камісіі пры ЦСПСБ аб прысудджэньні, з 42 прадпрыемстваў, якія ўключыліся ва ўсесаюзны конкурс,—лепшым з лепшых—пераходных сьцягаў: сьцяг ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ.

Асаблівымі паказчыкамі на права атрыманьня пераходнага сьцягу зьявілася: для заводу „Пролетары"—перавыкананьне прамфінпляну асобнага кварталу на 8,3 проц., выкананьне пляну па зьніжэньню сабекошту продукцыі на 10,1 проц., разгортваньне соц. спаборніцтва, ударніцтва і ўздым яго на вышэйшую ступень, стварэньне „скразных" брыгад, організацыя грамадзкага буксіра.

Для заводу „Бальшавік"—перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу на 8,87 проц. у колькасным выразе і цэнкасным—на 4,84 проц.; пры зьніжэньні сабекошту на 11,87 проц. супроць плянавых 8 проц. павышэньне продукцыйнасьці працы на 2,2 проц. звыш пляну, а таксама палепшаньне якасьці продукцыі, разгортваньне і пераход на новыя формы соц. спаборніцтва і ўдарніцства, конкрэтная барацьба з ілжэ-ўдарніцтвам, організацыя прапаноў рабочых.

Для заводу „Комунар"—перавыкананьне прамфінпляну асобнага кварталу на 5,6 проц., зьніжэньні сабекошту, перазаключэньне соц. спаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшую ступень, стварэньне скразных брыгад, вытворчых колектываў і комун, штурмавых брыгад і г. д.

Атрыманьне пераходнага сьцягу тым альбо іншым прадпрыемствам абавязвае партыйную, комсамольскую профсаюзную організацыі, абавязвае кожнага рабочага, комуністага, комсамольца замацаваць свае посьпехі, з бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за выкананьне плянаў 3-га, рашаючага году пяцігодкі, дабівацца новых якасных паказчыкаў у выкананьні гэтых плянаў. Тым больш, варта памятаць, што кожны сьцяг паасобку зьяўляецца пераходным сьцягам і права на яго атрыманьне праз 6 месяцаў будзе мець тое прадпрыемства, якое па-бальшавіцку перабудуе сваю работу, аўладае бальшавіцкімі тэмпамі, палепшыць якасьць. Выкананьне прамфінпляну з яго якаснымі паказчыкамі зьяўляецца для кожнай партыйнай, комсамольскай організацыі на прадпрыемстве мерылам уменьня мобілізаваць масы на барацьбу за генэральную лінію партыі, бо „комуністы, бальшавік, комсамолец пазнаюцца ў тэмпах плюс якасьць". Гэта асабліва павінны запамятаць організацыі прадпрыемстваў, якія адстаюць з выкананьнем прамфінпляну, палепшаньнем якасьці і інш.

Пераключэньнем соцспаборніцтва і ўдарніцтва на вышэйшыя формы, праз організацыю скразных, штурмавых брыгад плянава-опэрацыйных груп, грамадзкі буксір, праз організацыю па прыкладу Віцебскага заводу „Лекерта" конвэйеру якасьці, мобілізаваць увагу ўсіх рабочых, усіх комсамольцаў на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, на барацьбу за якасьць, на барацьбу супроць ілжэ-ўдарнікаў, прагульшчыкаў, шкоднікаў, опортуністых усіх колераў, агэнтаў клясавага ворага, зрываючых наша соцыялістычнае будаўніцтва.

Задача комсамольскай організацыі заключаецца зараз у тым, каб на справе зьдзейсьніць рашэньні 10 Усебеларускага, 9 Усесаюзнага зьездаў комсамолу, перабудаваць сваю работу так, каб соцспаборніцтва і ўдарніцтва ўзьняць на вышэйшую ступень і палепшыць якасьць продукцыі



За варштатам у баю за прамфінплян

Сьцягі імя ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ—заводу „Пролетары", Чырвонаштандартнаму зав. „Бальшавік" і „Комунар".

„...У гаспадарчай дзейнасьці ад комсамолу патрабуецца ня толькі шырокі размах, але асабліва важна якаснае павышэньне работы, затым якасьць работы, большавіцкія тэмпы і праверка выкананьня..." (КОСАРАЎ)

Пастанова конкурснай камісіі пры ЦСПСБ па прысудджэньні 3-х пераходных сьцягаў

Уключэньне 42-х прадпрыемстваў БССР ва ўсесаюзны конкурс на тры сьцягі і змаганьне за гонар першынства, выклікалі сярод рабочых мас новую хвалю творчага энтузіязму і актыўнасьці, накіраваных на вырашэньне конкрэтных вытворчых задач і зьявіліся магутным сродкам далейшай мобілізацыі рабочых мас на рэалізацыю адозвы ЦК УсеКП(б), на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу і пасьпяховую падрыхтоўку да трэцяга, рашаючага году пяцігодкі на аснове сустрэчнага прамфінпляну

Вядучы непрымірымую барацьбу за генэральную лінію партыі, згуртоўваючы вакол яе рабочыя масы і даючы рашучы бязьлітасны адпор праявам правага опортунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, „лявацкім" загібам, двурушніцтву і прымірэнцтву да іх, замяняючы ягоднае кіраўніцтва, няздольнае на даным этапе праводзіць генэральную лінію партыі,—заводы і фабрыкі, уступіўшыя ў конкурс, дабіліся ялізарнейшых посьпехаў у справе выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну,

Конкурсная камісія пры ЦСПСБ па прысуджаньню 3-х пераходных сьцягаў—ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМБ—і па адбору лепшых прадпрыемстваў для прэміяваньня на ўсесаюзным конкурсе на лепшае прадпрыемства,—пастанаўляе:

І. Прысудзіць пераходны сьцяг імя ЦК КП(б)Б—заводу „Пролетары"—Гомель:

за перавыкананьне прамфінпляну асобнага кварталу (на 8,3 проц.), выкананьне пляну па зьніжэньню сабекошту продукцыі (10,1 проц.);

за разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва і ўздым яго на вышэйшую ступень, стварэньне скразных брыгад, практыку грамадзкага буксіру, прыліў новых ударнікаў (218 чал.) і ахоп ударніцтвам на 1 студзеня 1931 г,—84,5 проц. агульнай колькасьці рабочых на заводзе;

за здавальняючае правядзеньне перавыбараў саветаў, своечасовае сканчэньне і здавальняючае правядзеньне колдагаворнай кампаніі і перавыкананьне пляну падпіскі на пазыку „Пяцігодка —у чатыры гады" (107,75 проц.)

за здавальняючую падрыхтоўку сустрэчнага прамфінпляну на 1931 г., з павышэньнем колькасьці продукцыі, супроць наметкі гаспадарчых органаў на 17,8 проц.

за значнае палепшаньне работы па організацыі прытоку рабочых прапаноў, іх рэалізацыі (ліквідацыя запазычанасьці па выкананьню рабочых прапаноў за 1931 г., пры ок 49 прапаноў на працягу асобнага кварталу з экономіяй у 150,5 тыс. руб.) і распрацоўку рацыяналізатарскага рахунку на 1931 г. у суме 150 тыс. руб.;

за конкрэтную работу па перабудове партыйнай і профэсыянальнай работы з перанясеньнем яе ў брыгады, групы (аформленьне „трыкутнікаў", перабудова работы вытворчых нарад і інш.):

за пасьпяховую організацыю прытоку рабочых у шэрагі КП(б)Б і ЛКСМБ (за квартал прынята ў партыю 70 чал., ёсьць яшчэ 69 заяў. у КСМ прынята 48 рабочых);

за організацыю раду прадпрыемстваў па палепшаньню матэрыяльна-бытавых умоў рабочых (організацыя закрытага разьмеркавальніка, палепшаньне рабочай сталоўкі, адкрыцьцё рамонтных майстэрняў).

2. Прысудзіць пераходны сьцяг ЦСПСБ гарбарні „Бальшавік"—Менск:

за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу ў колькасным выразе—108,87 проц., у цэннасным—104,84 проц., пры зьніжэньні сабекошту ў 11,87 проц. супроць плянавых 8 проц, і павышэньне продукцыйнасьці працы на 2,2 проц. звыш пляну, а таксама палепшаньне якасьці продукцыі;

за організацыю прытоку ў шэрагі КП(б)Б рабочых з вялікім вытворчым стажам;

за разгортваньне і ўзьняцьце на новыя формы соцспаборніцтва і ўдарніцтва (організацыя за квартал 42 ударных брыгад, з іх 17 скразных, прыток 225 ударнікаў, самазамацаваньне да канца пяцігодкі—58,5 проц. ад усёй колькасьці рабочых), конкрэтную барацьбу з ілжэ-ўдарніцтвам (праведзена самаправерка па соцыялістычных абавязацельствах, здсеяна 30 ілжэ-ударнікаў);

за організацыю значнага прытоку рабочых прапаноў (за квартал 296 з экономіяй у 37 тыс. руб.);

за здавальняючую масавую прапрацоўку сустрэчнага прамфінпляну, даўшага ўзрост продукцыйнасьці працы супроць наметак гаспадарчых органаў, па цэхах ад 11,1 проц. да 25,2 процантаў;

за добрае правядзеньне перавыбарчай кампаніі і гарсавету (яўка 100 проц.), здавальняючае правядзеньне колдагаворнай кампаніі і перавыкананьне пляну падпіскі на пазыку (12,7 проц.);

за організацыю раду прадпрыемстваў па паляпшэньню соцыяльна-бытавых умоў рабочых (палепшаньне работы сталоўкі з абслугоўваньнем усіх зьмен, організацыя 6 фэтаў па цэхах, організацыя сьвінарніка, закрытага разьмеркавальніка і рамонтных майстэрняў).

3. Прысудзіць пераходны сьцяг імя ЦК ЛКСМБ—заводу „Комунар"—Менск:

за перавыкананьне прамфінпляну асобнага кварталу ў колькасных паказчыках—5,6 проц., па продукцыйнасьці працы—0,2 проц., па зьніжэньні сабекошту—0,5 проц, з аднačасовым зьмяншэньнем колькасьці рабочай сілы на 0,8 проц. супроць пляну;

за значнае разгортваньне соцспаборніцтва ва ўсіх яго формах (організаваны за асобны квартал 4 ударныя брыгады, 3 скразныя брыгады, 6 вытворчых колектываў, 9 комун і адна штурмовая брыгада з ахопамі на 1-І—31 году 97,1 проц. усёй колькасьці рабочых заводу; самазамацавалася да канца пяцігодкі—95,5 проц.);

за організацыю шырокага прытоку рабочых прапаноў (354 за квартал) і складаньне рацыяналізатарскага рахунку на 1931 год з 157 прапаноў на суму 250 тыс. рублёў;

за дасягненьні ў справе мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў (сабрана 210 тон лому замест 80 тон паводле пляну);

за добра праведзеную работу на перавыбарах гарсавету і падпісцы на пазыку (перавыкананьне пляну на 64 проц.);

за прыток у шэрагі партыі (за квартал 66 рабочых заводу);

за пасьпяховую работу па перабудове комсамольскай работы, накіраванай на выкананьне прамфінпляну асобнага кварталу, актыўны ўдзел і ініцыятыву комсамолу ў організацыі соцспаборніцтва і ўдарніцтва і ўздым яго на вышэйшую ступень (комуны, скразныя брыгады, самазамацаваньне), актыўны ўдзел у рацыяналізатарскіх мерапрыемствах і масава-выхаваўчую работу сярод рабочай моладзі;

за організацыю сустрэчнага прамфінпляну на 1931 год з павышэньнем колькасьці продукцыі, якая выпускаецца, у сярэднім на 17 проц.;

за палепшаньне соцыяльна-бытавых умоў рабочых (організацыя сталовай па прыкладу „Электропровода", організацыя адкормачнага пункту, закрытага разьмеркавальніка, рамонтных майстэрняў і інш.).

4. Побач з прысуджэньнем прадпрыемствам пераходных сьцягаў,—конкурсная камісія лічыць неабходным прадставіць гэтыя ж заводы, як паказаўшыя лепшыя ўзоры бальшавіцкай барацьбы за прамфінплян асобнага кварталу, якія змаглі спачатку ўзяць неабходныя тэмпы і трымаць іх на працягу ўсяго кварталу, для прэміяваньня на ўсесаюзным конкурсе на лепшыя прадпрыемствы.

5. Аднačасова з гэтым конкурсная камісія прадстаўляе для прэміяваньня на ўсесаюзным конкурсе друкарню „Палесдрук" і машына-будаўнічы завод „Энэргія", констатуючы, што:

а) „Палесдрук", зьяўляючыся ініцыятарам аднэй з вышэйшых форм соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, вытворчых манэўраў—праверачных дзесяцідневак—пасьпяхова праверыў гэты вопыт работы на сваім прадпрыемстве. Побач з гэтым „Палесдрук" перавыканаў прамфінплян асобнага кварталу на 0,5 проц; (у колькасным паказчыку); ударніцтвам у друкарні ахоплена 90 проц. усяго колектыву, самазамацавалася да канца пяцігодкі 70 проц. У партыю перадана за квартал 50 чал., у ЛКСМБ—52.

б) Завод „Энэргія" выканаў прамфінплян асобнага кварталу на 106,43 проц.—у цэннасным азначэньні, пры зьніжэньні колькасьці рабочай сілы на 0,8 проц. супроць пляну і перавыкананьне плянаў па павышэньню продукцыйнасьці працы на 13,35 проц. Прыток у партыю за квартал даў 55 таварышоў, Ахоплена ўдарніцтвам 69 проц. агульнай колькасьці рабочых, самазамацавалася да канца пяцігодкі 67 проц.; паступіла за квартал 149 рабочых прапаноў з эфэктнасьцю ў 146 тыс. р. Плян падпіскі на пазыку перавыканан на 8 проц,

6. Азначаючы рад буйных дасягненьняў у рабоце заводаў, якія вышлі ў першых радох па выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну асобнага кварталу і прадстаўленых для прэміяваньня па конкурсах, конкурсная камісія пры ЦСПСБ зварачае ўвагу ўсіх організацый і рабочых гэтых прадпрыемстваў на неабходнасьць больш рашучай барацьбы за якасьць продукцыі і барацьбы з бракам

Аднačасова з гэтым, конкурсная камісія зварачае ўвагу організацый ўсіх прадпрыемстваў на неабходнасьць далейшай упартай работы ўсіх звеньняў заводу і яго організацый за канчатковую дакладную перабудову ўсёй работы ў адпаведнасьці з пастановамі 5-га пленуму УсеЦСПС.

7. Конкурсная камісія лічыць неабходныя передаць пераходныя сьцягі лепшым прадпрыемствам тэрмінам на 2 кварталы з тым, каб і ў далейшым, пасьля кожнага паўгодзьдзя, пераглядаць справу прысуджэньня пераходных сьцягаў прадпрыемствам, якія дасягнуць лепшых паказчыкаў на ўсіх умовах конкурсу за паўгодзьдзе.

Камісія з асобнай сілай падкрэсьлівае што абавязковай умовай конкурсу на атрыманьне пераходных сьцягаў і надалей, побач з выкананьнем усіх колькасных паказчыкаў прамфінпляну, павінна быць бязумоўна выкананьне якасных паказчыкаў,

8. Далейшую работу па праверцы дасягненьняў прадпрыемстваў на конкурсе неабходна праводзіць шляхам організацыі вакол гэтай справы яшчэ большай масавасьці праз прыцягненьне ўдарнікаў, добраахвотнікаў, профактыву і большага асьвятленьня ў друку, а таксама шляхам вызначэньня ўзаемаправерачных брыгад.

9) Камісія лічыць неабходным правесьці перадачу сьцягаў на шырокіх рабочых сходах праз спэцыяльна вызначаныя дэлегацыі, шырока скарыстаўшы гэта мерапрыемства для далейшай мобілізацыі рабочых мас на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну пяцігодкі за чатыры гады, на барацьбу за генэральную лінію партыі.

КОМСАМОЛ ВЕУ І БУДЗЕ ВЕСЬЦІ БЯЗЬЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ З НАЦЫЯНАЛІСЦКІМІ УХІЛАМІ

Садаклад т. Джавахідзэ „аб нацыянальна-культурным будаўніцтве ў СССР і задачах УсеЛКСМ“ на IX зьездзе ЎсеЛКСМ*)

Нацыянальная культура—важнейшы вучастак

Пераходжу да пытаньня аб нацыянальна-культурным будаўніцтве, якое зьяўнецца камнем спатыканьня для шмат каго, хто займаецца нацыянальным пытаньнем.

Нацыянальна-культурнае будаўніцтва зьяўляецца неад'емнай часткаю ўсяго соцыялістычнага будаўніцтва. Без пасьпяховага разгортваньня культурнай рэволюцыі, бяз уздыму на высокую ступень культурнага ўзроўню працоўных усіх нацыянальнасьцяй СССР нельга выканаць лёзунг: „дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканомічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны“. Магутнае разьвіцьцё культуры, укараненьне яе ў самыя шырокія масы працоўных будзе пасьпяхова праходзіць толькі пры ўмове, калі гэтая культура будзе прыналежыцца на зразумелай для іх мове і ў формах, адпавядаючых умовам жыцьця данай нацыянальнасьці. Мы павінны абвясьціць самую рашучую барацьбу з ваганяючымі, якая сьцьвярджае, што ня можа быць нацыянальнай на форме і разам з тым пролетарскай па зьмесце культуры.

Мы павінны павесьці таксама рашучую барацьбу супроць тых, якія часам над сьцягам інтэрнацыяналізму імкнуцца сарваць нацыянальна-культурнае будаўніцтва.

Пабудаваць па форме нацыянальную і па зьмесце пролетарскую культуру, гэта значыць палегчыць, надзвычайна палегчыць для раней адсталых нацыянальнасьцяй асваеньне і аўладаньне ўсімі багацьцямі сусьветнай культуры. Ясна, што мільёны людзей, якія ня ведаюць іншай мовы, акрамя сваёй роднай, ня могуць далучыцца да культуры на незразумелай ім мове. Адносіны нашай партыі да пытаньняў нацыянальна-культурнага будаўніцтва сформуляваны тав. Сталіным асабліва выразна, дыялектычна наступным чынам

„Але што такое нацыянальная культура? Як сумясьціць яе з пролетарскай культурай? Хіба не гаварыў Ленін яшчэ да вайны, што культур у нас дзьве—буржуазная і соцыялістычная, што лёзунг нацыянальнай культуры ёсьць рэакцыйны лёзунг буржуазіі, якая стараецца атруціць сьвядомасьць працоўных атрутаю нацыяналізму? Як сумясьціць будаўніцтва нацыянальнай культуры, разьвіцьцё школ і курсаў на роднай мове і выпрацоўку кадраў з мясцовых людзей з будаўніцтвам соцыялізму, будаўніцтвам пролетарскай культуры? Ці няма тут непраходнай супярэчнасьці? Бязумоўна няма!

Мы будуем пролетарскую культуру, гэта зусім правільна. Але правільна таксама і тое, што пролетарская культура, соцыялістычная па свайму зьместу, прымае розныя формы і спосабы выражэньня ў розных народаў, уцягнутых у соцыялістычнае будаўніцтва, у залежнасьці ад розьніцы мовы, быту і г. д. Пролетарская па свойму зьместу, нацыянальная па форме,—вось тая агульная чалавечая культура, да якой ідзе соцыялізм. Пролетарская культура не адмяняе нацыянальнай культуры, а дае ёй зьмест, і наадварот. нацыянальная культура не адмяняе пролетарскай культуры, а дае ёй форму“. (І. Сталін, „Пытаньні ленінізму“, стар. 257).

Пасьля гэтага робіцца зусім ясным, што разьвіцьцё нацыянальнай культуры вядзе да агромністага ўздыму актыўнасьці і ўзроўню разьвіцьця нацыянальнасьцяй усяго Савецкага Саюзу. Гэта разьвіцьцё культуры пастасавальна да асаблівасьцяй кожнай нацыянальнасьці ўзбагачае скарбніцу агульна-соцыялістычнай культуры, палягчае далейшы рост культуры і дасягненьне нябывалага росквіту.

Тыя, хто выступаюць супроць нацыянальнай культуры, зрываюць наша культурнае будаўніцтва ў цэлым, а ня толькі нацыянальных рэспублік і абласьцей. Але гэта далёка не азначае, што ў разуменьні нацыянальнай культуры нама скажэньняў, няма рэакцыйных пунктаў погляду. Нацыяналістычныя элемэнты разьвіцьця нацыянальнай культуры разумеюць як разьвіцьцё культуры нацыянальнай ня толькі па форме, але і па свайму зьместу, і дзеля гэтага імкнуцца загнаць растучыя нацкультуры ў буржуазна-нацыяналістычныя рамкі.

Гэтыя спробы клясавага ворага ўнесьці свой уплыў у разьвіцьцё нацкультур асабліва востра адчуваюцца ў нацыянальнасьцяй, атрымаўшых ад мінулага моцныя кадры буржуазнай нацыяналістычнай інтэлігенцыі (на Украіне, у Грузіі і Арменіі. Гэтыя спробы знаходзяць нярэдка сваё адлюстраваньне ў літаратуры, у мастацтве і іншых элемэнтах культуры.

---

*) Канец. Пачатак гл. у № 24 „Ч. З“.

Тут наша задача заключаецца ў максымальным узмоцненьні клясавай пільнасьці і ў бязьлітасным адпоры ўсялякім спробам выкарыстаць разьвіваючыяся нацыянальныя культуры для агітацыі буржуазнай ідэолёгіі.

Трэба рашуча ажыцьцёвіць кіруючую ролю пролетарыяту ў разьвіцьці нацыянальнай культуры. 16 зьезд партыі паставіў пытаньне аб шырокім разьвіцьці нацыянальнай культуры, але гегемонія ў гэтай справе павінна належаць рабочай клясе, а не буржуазным і дробна-буржуазным элемэнтам.

Скажам, задача украінізацыі надзвычайна важна, як моцная зброя ў справе разьвіцьця і ўмацаваньня украінскай пролетарскай дзяржаўнай культуры і г. д.

Тав. Кагановіч на VII усеукраінскім зьезьдзе комсамолу „усыпаў“ комсамолу Украіны за тое, што комсамольцы вельмі дрэнна украінізуюцца і што комсамол на задачы украінізацыі не зварочвае належнай увагі. Неабходна адзначыць некаторы свае асаблівы „нігілізм“, г. зн. наплавацельскі погляд сярод моладзі ў адносінах нацыянальнага пытаньня. Гэта зьява вельмі шкодная і грае на руку клясаваму ворагу. Нярэдка комсамольцы лічаць, што для іх нацыянальнае пытаньне не актуальнае. Яны, відаць не разумеюць таго, што тым самым яны даюць монополію на вырашэньне столькі важнай проблемы пролетарскай рэволюцыі буржуазным элемэнтам, якія, бязумоўна, заўсёды рады старацца вырашыць пытаньні нацыянальнага і культурнага будаўніцтва ў сваю карысьць. У вырашэньні проблем нацыянальна-культурнага будаўніц ва пролетарыят быў і застанецца гегемонам.

Вырасьціць спэцыялістых нацыяналаў

Некалькі слоў аб нашых практычных задачах па культурнай рабоце і перш за ўсё аб задачы падрыхтоўкі кадраў. У гэтым напрамку павінны быць сконцэнтраваны агонь і ўвага на месцох, бо проблема кадраў цесна ўвязана з проблемай усяго соцыялістычнага будаўніцтва У гэтых адносінах неабходна яшчэ больш націснуць на ажыцьцяўленьне програм школьнага будаўніцтва, вылучэньне і пасылку ў навучальныя ўстановы прамысловых цэнтраў у масавым парадку батрацтва, рабочай і калгаснай моладзі розных нацыянальнасьцяй, забясьпечыўшы тым самым падрыхтоўку кадраў інжынэраў, тэхнікаў, аграномаў, настаўнікаў і іншых спэцыялістых з мясцовых нацыянальнасьцяй.

Цэлы рад прыведзеных на мясцовых конфэрэнцыях фактаў гаворыць аб тым, што політэхнізацыя школ, асабліва ў нашых нац. рэспубліках, праходзіць туга. Але, паміж іншым, аказваецца, што ў некаторых нацрэспубліках, дзе школьнае будаўніцтва па сутнасьці пачалося ўсьлед пасьля Кастрычніцкай рэволюцыі, палітэхнізацыя прывіваецца лягчэй, ня глядзячы на цяжкасьці з кваліфікаванымі пэдагогічнымі кадрамі, бо там няма традыцый старое схолястычнае школы. Тут мы павінны ўзяцца за справу з усёй уласьцівай нам энэргіяй.

Але самай першарадовай нашай задачай у нацрэспубліках і абласьцёх зьяўляецца задачай ліквідацыі альфабэтнай няпісьменнасьці і правядзеньне ўсеагульнага пачатковага навучаньня.

Задача комсамолу — прывесьці ў рух усе ініцыятыўных і твор чыя сілы краіны на барацьбу за правядзеньне ўсеагульнага пачатковага навучаньня, за хутчэйшую ліквідацыю няпісьменнасьці. Трэба будзе прыняць цэлы рад мер па арганізацыі спэцыяльных курсаў, па арганізацыі масавай падрыхтоўкі пэдагогічных кадраў з ліку моладзі.

Павысіць тэмпы росту саюзу

Нашы абяцаньні, якія мы далі Наркамасьветы аб правядзеньні ўсеагульнага пачатковага навучаньня, аб правядзеньні ліквідацыі няпісьменнасьці, гэтыя абяцаньні з патроенай энэргіяй павінны быць праведзены ў жыцьцё ў нацрэспубліках. Трэба прыняць усе меры нам, комсамолу, для таго, каб у пытаньнях школьнага будаўніцтва комсамол сапраўды іграў першую скрыпку, нёс адказнасьць за значную частку выкананьня гэтай справы.

Дазвольце ў некалькіх словах спыніцца на групе арганізацыйных пытаньняў.

Перш за ўсё перад нам стаіць задача павысіць тэмпы ахопу моладзі мясцовых нацыянальнасьцяй комсамолам. Гэта, бязумоўна, ня значыць, што мы ў пагоні за колькасным ахопам моладзі будзем уцягваць у шэрагі УсеЛКСМ усіх, хто гэтага пажадае. Гэта значыцца, што мы ў нашых нацыянальных рэспубліках уцягваем у комсамол пролетарскую, паўпролетарскую моладзь—маладняк беднякоў і колгасьнікаў. Мы павінны яшчэ больш ахапіць моладзь карэнных нацыянальнасьцяй комсамолам, праяўляючы пры гэтым максымальную клясавую пільнасьць і ні ў якім разе не допушчаючы падмены клясавай лініі ў політыцы росту імкненьнямі да колькаснага ахопу. Задачу колькаснага росту саюзу трэба злучыць з задачай клясавага адбору, усямернага ўзмацненьня пролетарскага ядра ў нашых нацыянальных абласьцёх.

Мы маем бязумоўна вялікія дасягненьні ў вылучэньні, у вырашчваньні саюзнага актыву з карэнных нацыянальнасьцяй. Агромністыя кадры актыву вылучаны ня толькі на саюзную работу, але і па ўсіх лініях нашай савецкай грамадзкасьці, як аб гэтым ужо было ўпамянута. Але гэтага яшчэ недастаткова. Мы павінны яшчэ больш рашуча высоўваць актыў з пролетарскай і колгаснай моладзі і ажыцьцявіць задачу комплектаваньня к'руючага актыву ў нацыянальных раёнах у асноўным з карэннай моладзі, з тым, каб нам усё менш і менш перакідваць у далейшым актыў з цэнтральных раёнаў на работу ў нацрэспублікі і вобласьці.

Вырваць дзяўчыну з акоў старога быту

Далёка пасунулася ўперад таксама вялікая справа вызваленьня працоўнай жанчыны Ўсходу. Агромністыя масы працаўніц зьнялі паранджу, чадру, уцягнуты ў прамысловасьць і выйшлі на шырокі шлях грамадзкай дзейнасьці. У барацьбе за вызваленьне працоўнай жанчыны Ўсходу комсамол іграе вялікую ролю як выхаваўчая організацыя, шырока ўцягваючы ў свае шэрагі дзяўчат.

Але пакуль наша работа па ўцягваньню ў саюз дзяўчат нацыяналак ні ў якім разе ня можа быць прызнана здавальняючай, ня гледзячы на выключныя цяжкасьці ў рабоце з імі, у асаблівасьці ў раёнах уплыву ісламу. Мы павінны высунуць цэлы рад гнуткіх форм работы, адказваючых мясцовым, бытавым і іншым умовам, і праз папярэднюю масавую работу шырока ўцягнуць дзяўчат у комсамол.

Асноўнае заключаецца ў тым, каб максымальна выкарыстаць жаночы комсамольскі актыў, якім мы ўладаем. У нас няма ніводнай організацыі ў нацраёнах, дзе ня меліся-б адпаведнага актыву дзяўчат. А мы часам ня ўмеем дастаткова выкарыстоўваць гэты магутны вагар для правядзеньня работы з пазасаюзнай масай дзяўчат. Мы недастаткова вядзем папярэднюю работу з імі для таго, каб у выніку прыняць іх у комсамол. Мы яшчэ слаба працуем над усякімі формамі папярэдняй масавай работы з імі—культурнай, асьветнай, школьнай і інш.

Гістарычную ролю адыграюць піонэры

Вялікую ролю павінны адыграць таксама піонэрскія організацыі. Ніводная организацыя ня можа практычна зрабіць столькі, колькі можа зрабіць піонэрская организацыя ў справе канчатковага выжыцьця векавых забабонаў, таму што піонэры—самая масавая організацыя, маючая магчымасьць ахапіць у сваіх шэрагах вялікую колькасьць дзяўчынак.

Школа павінна ахапіць шырокую масу дзяўчынак. Гэтыя дзіцячыя кадры найбольш лёгка паддаюцца нашаму выхаваньню. Задача піонэрскай организацыі заключаецца ў яшчэ большым пашырэньні сваёй организацыі, узмацненьні выхаваўчай работы, у барацьбе з агіднымі перажыткамі быту праз гэтае падрастаючае пакаленьне.

Мы павінны ўсе мэтоды, усе формы нашай работы выкарыстаць у бок вызваленьня жанчын Усходу, у бок канчатковага выжыцьця крывавай помсты і іншых адмоўных бытавых перажыткаў. Піонэрскія организацыі могуць адыграць і заклікаты адыграць у гэтых адносінах гістарычна рашаючую ролю. Піонэрская организацыя ў гэтых адносінах будзе тэй организацыяй, якая канчаткова выжыве ўсякія нацыянальныя забабоны, канчаткова выжыве няроўнасьць паміж жанчынай і мужчынай Усходу.

Аўладаць рэволюцыйнай тэорыяй

Мне хацелася-б спыніцца на пытаньні аб тэорытычнай вучобе. Я лічу, што ў гэтых адносінах у нас у нацыянальных раёнах справа стаіць надзвычайна няважна.

Неабходна ва што-б там ні было ўтварыць больш шырокую політычную літаратуру на нацмовах. Разам з тым. мы павінны прыняць усе меры да выхаваньня кадраў пропагандыстых з карэнных нацыянальнасьцяй. Бяз гэтых дзьвёх рашаючых умоў—бяз кадраў і без літаратуры—у нас няма магчымасьці перамагчы тое адставаньне, якое маецца ў гэтай справе. Разам з тым трэба забясьпечыць у сыстэме нашай асьветы вывучэньне марксысцка-ленінскай тэорыі па нацыянальнаму пытаньню ва ўсёй яе паўнаце.

Нацыянальнае пытаньне павінна быць вывучана і ўцямлена ня толькі комсамолам нацыянальных рэспублік і абласьцей, але і ўсім саюзам у цэлым.

Узмацняць фронт абароны

Стары царскі ўрад не даваў раду нацыянальнасьцяй зброі, справядліва апасаючыся тэй гадзіны, калі зброя павернецца супроць сапраўднага ворага гэтых народаў, супроць самаўладзтва і капіталізму. Савецкая ўлада ня толькі не баіцца таго, што працоўныя гэтых нацыянальнасьцяй аўладаюць ваеннымі ведамі, але і ўсяляк вядзе шырокую работу па ваенізацыі гэтых мас працоўных СССР. Для ўсіх ясна, што працоўныя ўсіх нацыянальнасьцяй нашай краіны бязьмежна адданы інтарэсам сваёй вялікай соцыялістычнай бацькаўшчыны і кро на зацікаўлены ва ўзмацненьні яе баявой магутнасьці.

Работу па ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны мы павінны выкарыстаць як магутную зброю інтэрнацыянальнага выхаваньня моладзі, укараняючы ў сьвядомасьць комсамольцаў непарыўную еднасьць клясавых інтарэсаў працоўных усіх нацыянальнасьцяй СССР у барацьбе супроць замаху імпэрыялізму на заваёвы Кастрычнікавай рэволюцыі. Выключную ўвагу павінен удзяліць комсамол усямернаму ўмацаваньню маючыхся нацыянальных вайсковых аб'яднаньняў і ўкараненьню сыстэматычнай работы па ваенізацыі ўглыб самых шырокіх пластоў працоўнага насельніцтва.

Комсамол вёў і будзе весьці бязьлітасную барацьбу з нацыяналісцкімі ўхіламі

Абвастраньне клясавай барацьбы вядзе да актывізацыі нацыяналістычных ухілаў у шэрагах партыі і комсамолу ў бок вялікадзяржаўнага шовінізму і мясцовага нацыяналізму. Наша партыя заўсёды вяла і вядзе непрымірымую барацьбу з усялікімі ўхіламі і ў нацыянальным пытаньні. Комсамол вёў і будзе весьці самую бязьлітасную барацьбу з паўзучымі нацыяналістычнымі ўхіламі і перш за ўсё з вялікадзяржаўным шовінізмам, як з галоўнай небясьпекай на даным этапе, якая

„зьяўляецца ў імкненьні абыйсьці нацыянальныя розьніцы мовы, культуры, быту; у імкненьні падрыхтаваць ліквідацыю нацыянальных рэспублік і абласьцей; у імкненьні падарваць прынцып нацыянальнага роўнапраўя і разьвянчаць політыку партыі па нацыяналізацыі апарату, нацыяналізацыі прэсы, школы і іншых дзяржаўных і грамадзкіх організацый. Няцяжка зразумець, што гэты ўхіл адбівае імкненьне аджываючых клясаў панаваўшай раней вялікарасійскай нацыі вярнуць сабе страчаныя прывілеі.

Адсюль небясьпека вялікарасійскага шовінізму, як галоўная небясьпека ў партыі ў галіне нацыянальнага пытаньня“. (Сталін).

Разам з тым трэба заўважыць, што, зьяўляючыся галоўнай небясьпекай. вялікадзяржаўны ўхіл нярэдка выступае пад сьцягам інтэрнацыяналізму.

Вялікадзяржаўны шовінізм нярэдка захоплівае таксама і моладзь, выхадцаў з раней прыгнечаных нацыянальнасьцяй. Сконцэнтраваўшы агонь па вялікадзяржаўным шовінізьме, трэба разам з тым весьці самую рашучую барацьбу з мясцовым нацыяналізмам, які

„зьяўляецца ў імкненьні абасобіцца і замкнуцца ў рамках сваёй нацыянальнай скарлупы, у імкненьні затушаваць клясавыя супярэчнасьці ўнутры сваёй нацыі, у імкненьні абараніцца ад вялікарасійскага шовінізму шляхам адыходу ад агульнай плыні соцыялістычнага будаўніцтва, у імкненьні ня бачыць таго, што збліжае і злучае працоўныя масы нацыянальнасьцяй СССР і бачыць толькі тое што можа аддаліць іх адну ад аднае.

Ухіл к мясцоваму нацыяналізму адлюстроўвае нездавальненьне аджываючых клясаў раней прыгнечаных нацый рэжымам дыктатуры пролетарыяту, іх імкненьне аб[...] собіцца ў сваю нацыянальну[...] дзяржаву і ўстанавіць там св[...] клясавае панаваньнё.

Небясьпека гэтага ўхілу зья[...] ляецца ў тым, што ён культыв[...] буржуазны нацыяналізм, аслабл[...] адзінства працоўных народаў СС[...] і грае на руку інтэрвэнцыявісты[...] (Сталін-Кагановіч, Справаздача [...] XVI зьезду УсеКП(б), стар. 12, 1[...]

Такім чынам, барацьба з вялік[...] дзяржаўным шовінізмам, як з гало[...] най небясьпекай. і з мясцовым нацы[...] налізмам, рашучае выкрыцьцё ў [...] на кожным конкрэтным прыкла[...] чаяньняў клясавага ворага ёсь[...] асноўнае ў інтэрнацыянальным вы[...] ваньні моладзі.

Кожны комсамолец—уда[рнік] інтэрнацыяналізму

Інтэрнацыянальнае выхаваньне [...] нашым саюзе ня вычэрпваецца і т[...] што ў нас існуюць спэцыяльн[...] ўпаўнаважаныя па інтэрнацыянальн[...] рабоце, спэцыяльныя організатары [...] тэрнацыянальнай работы ў ячэйк[...] Пытаньне інтэрнацыянальнага вы[...] ваньня становіцца значна шырэй. [...] патрабуе таксама таго, каб комса[...] лец Масквы, Ленінграда Сталінгр[...] скага трактарнага заводу, прадпры[...] стваў вырабляючых трактары і інш[...] машыны для нац. рэспубік і вобла[...] цей, здолеў-бы растлумачыць мола[...] той няўхільны факт, што гэтыя маш[...] ны вызваляюць яе ад страшнай сп[...] чыны векавога жабрацтва і бяскул[...] тур'я, набліжаюць да соцыялізму ко[...] нага узбэкскага, казакскага, таджы[...] скага селяніна, і што, з другога бо[...] гаспадарчыя і культурныя посьп[...] нац. рэспублік надзвычайна ўмацоў[...] юць позыцыі соцыялізму.

Некаторыя „мудрацы“ у нашым [...] юзе дагаварыліся да таго, што пра[...] навалі „падзел працы“ у барацьб[...] нацыяналізмам паміж расійскай ча[...] кай комсамолу і астатняй, якая з[...] дзіцца да таго, каб з вялікадзярж[...] ным ухілам змагаліся толькі расійі[...] а з мясцовым нацыяналізмам [...] астатнія. Антыпартыйная, антыбальш[...] віцкая пастаноўка пытаньня зусім [...] давочна. Як вялікадзяржаўнасьць ёс[...] зьява, якую трэба вырваць з карэньн[...] так і мясцовы нацыяналізм павін[...] быць бязьлітасна зьнішчаемы ўс[...] комсамольцамі, бяз розьніцы, да як[...] нацыянальнасьці яны адносяцца. [...] ня можа быць ніякага „падзелу п[...] цы“, тут павінен быць агульны нас[...] пальны фронт. Комсамольцы заўсё[...] памяталі і будуць памятаць, што я[...] „вядуць работу сярод рабочых і сял[...] самых розных нацыянальнасьцяй. [...] комсамол зьяўляецца некаторым па[...] бенствам сваеасаблівага нацыяналіз[...] Пры гэтым тут грае ролю ня тол[...] нацыянальны склад комсамолу. ал[...] той факт, што комсамол непасрэд[...] прымыкае да УсеКП(б), утвараю[...] адзін з важнейшых атрадаў сусьвет[...] га пралетарскага інтэрнацыяналу. [...] тэрнацыяналізм зьяўляецца асноў[...] ідэяй, якая прасякае работу комса[...] лу. У гэтым яго сіла, у гэтым [...] моц. Трэба, каб дух інтэрнацыяналіз[...] вітаў заўсёды над комсамолам. Трэ[...] каб посьпехі і няўдачы ў барацьб[...] пролетарыяту нашай краіны зьвязвал[...] ў сьвядомасьці комсамольцаў з пос[...] пехамі і няўдачамі міжнароднага рэ[...] люцыйнага руху, трэба, каб нашу [...] волюцыю навучыліся разглядаць ко[...] самольцы не як самамэту, а як срод[...] і падспор'е для перамогі пролетарск[...] рэволюцыі ва ўсіх краінах“ (І. Ста[лін] „Пыт. ленінізму“, стар. 3261).

Наша краіна дасягнула ў пытан[...] вырашэньня нацыянальнай політ[...] сапраўдных вялізарных посьпехаў.

Народы і нацыянальнасьці, якія [...] сяляюць Савецкі Саюз, згуртаваны [...] ніколі ў адзін моцны, монолітны са[...] і праяўляюць бязьмежную рашучас[...] змагацца за яго.

На нашу долю, на долю мола[...] выпала агромністая гістарычная чэсь[...] канчаткова выжыць усялякія элемэн[...] нацыянальнай няроўнасьці, усялякі[...] элемэнты нацыянальных забабонаў. [...] нашу долю выпала канчаткова зьме[...] ці ўсе рэшткі нацыянальнага прыгн[...] чаньня, якое было гвалтоўна насадж[...] ема ў праклятым царскі час. Мы, та[...] рышы. комсамол, пад сьцягам і [...] штандарам якога зараз ідуць мільё[...] ныя масы моладзі, яшчэ вышэй узн[...] мем сьцяг пролетарскага інтэрнацы[...] налізму, сьцяг пролетарскай эвол[...] цыі, сьцяг, пад якім могуць прыйсь[...] да сва го вызваленьня прыгнечаныя [...] зьняволеныя народы сьвету (В[...] плескі).

ПРАДВЯСЕНЬНЯЯ ПРАВЕРКА

Менгарсавет, Вульскі раён, МЦРК і ЦСПСБ ня выконваюць рашэньні сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі

У рашучай барацьбе з опортунізмам на два фронты—узьнімем тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы і барацьбу за новыя арміі колгасьнікаў

Комсамол, організуй праверку свайго ўдзелу

Менск, 1-га лютага

Выкананьне агромністых задач, якія стаяць перад другой бальшавіцкай вясной 3-га, рашаючага году пяцігодкі, калі мы павінны за кончыць пабудову фундаманту социялістычнай экономікі залежыць ад таго, наколькі будуць мобілізаваны ўсе партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя органі-зацыі гораду і вёскі на гэты фронт.

Посьпех правядзеньня сяўбы будзе залежаць ад таго, наколькі гэта кампанія будзе ўвязана з выкананьнем задач партыі па социялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, якія вызначаны для 3-га году пяцігодкі.

Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б па дакладу тав. **Рачыцкага** аб социялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і вясеньняй пасеўнай кампаніі адзначыў, што „існуючыя тэмпы падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы ні ў якім разе не забясьпечваюць выкананьня намечаных заданьняў“, што ва ўсей падрыхтоўчай рабоце да сяўбы няма яшчэ сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў, як „ кампаніі, выкананьне плянаў якое зьяўляецца важнейшай часткай 3-га году пьцігодкі.

Гэта ў значнай меры падцьвярджаюць матар'ялы налётаў нашых юнкораўскіх брыгад на паасобныя ўстановы г. Менску і матар'ялы з Вульскага раёну. якія зьмяшчаюцца ў сеньнешнім нумары.

Гэтыя матар'ялы сьведчаць аб права-опортуністычных адносінах райколгассаюзу Менску і Вульскага раёну, Менгарсавету да выкананьня плянаў вясеньняй пасеўкампаніі.

Паўтараем, тэмпы падрыхтоўкі да вясеньняга севу ў шэрагу месц нездавальняючыя. Комсамольскія ячэйкі павінны зараз-жа ўключыцца ў падрыхтоўку да сяўбы, на рэалізацыю адозвы СНК і ЦК УсеКП(б).

Організуем масавы паход комсамольцаў гораду на вёску па рэалізацыі адозвы СНК і ЦК, а таксама па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы.

У завірусе цыркуляраў

ЦСПСБ вынес рад пастаноў аб удзеле профсаюзных організацый у правядзеньні вясеньняй пасеўкампаніі і колектывізацыі. Але гэтыя пастановы засталіся на паперы, не даведзены да шырокіх мас. Члены профсаюзу не мобілізаваны на выкананьне рашэньняў сьнежаньскага пленуму аб разьвіцці прыгарадных гаспадарак.

Профсаюзныя ячэйкі на фабрыках і заводах зусім слаба мобілізоўваюць масы рабочых вакол задач організацыі прыгарадных гаспадарак і дапамогі вясковым організацыям у колектывізацыі сельскай гаспадаркі. Да гэтага часу па лініі ЦСПСБ на пасеўкампанію накіраваны толькі 14 брыгад, аб працы якіх ЦСПСБ ня мае ніякіх вестак.

Такі вынік „сувязі“ ЦСПСБ з месцамі.

Недапушчальна слаба разгорнута работа па дапамозе колгасам у рамонце сельска-гаспадарчага інвэнтара. У гэтай галіне ЦСПСБ, за выключэньнем прыгожых пастаноў, яшчэ ня ўжыў ніякіх практычных мер.

ЦСПСБ і ўсе проф'ячэйкі павінны тэрмінова пасіліць сваю работу па пасылцы брыгад, па колектывізацыі, падрыхтоўцы да сяўбы, рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара. Мобілізаваць шырокія масы рабочых на практычны ўдзел у організацыі прыгарадных гаспадарак для рабочага забясьпечаньня.

Брыгада „Ч. З.“ і курсаў КСМ актыву—Пальвінскі і Фіалкін



—„Ну, тащися, Сивка!“...

МЦРК не сьпяшаецца

Зусім слаба разгорнута работа МЦРК па падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі і організацыі прыгарадных гаспадарак.

Як выконваецца плян загатоўкі насеннага матар'ялу для прыгарадных гаспадарак? Насеньня сталовых буракоў загатоўлена 10 проц. пляну, раньняй капусты—20 проц., раньняй бульбы—30 проц., кармовых буракоў, морквы ігуркоў зусім не загатоўлена, парніковых гуркоў 50 проц.

Нівоцная гаспадарка МЦРК не распачала рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара, не організавала брыгад па рамонту.

Зусім бязьдзейнічае комсамольскі колектыў МЦРК: не прапрацаваў пытаньня падрыхтоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі, ня прымае ніякіх мер для пасьпяховага выкананьня плянаў загатоўкі насеньня і рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара.

Брыгада „Ч. З.“ і курсаў КсМ актыў М. Ш. і Л.

Правыя опортуністыя зрываюць падрыхтоўку

Копыль—Па рыхтоўка да вясеньняй сяўбы ў раёне праходзіць марудна. Пляны ня складзены, насенныя фонды ня створаны. Заданьне па пашырэньню плошчы пасеваў да колгасаў і аднаасобнікаў не даведзены.

Малацьба ў раёне не разгорнута.

Куды г рш з сартоўкай і ачысткай насеньня.

Час па-ончыць з опортуністычнымі адносінамі да падрыхтоўкі другой бальшавіцкай вясны.

А. Гонін.

Менгорсавет дрэнна рыхтуецца да вясеньняй кампаніі

Плянам вясеньняй пасеўкампаніі Менгорсавету мяркуецца давесьці плошчу прыгарадных гаспадарак у саўгасах і колгасах: пад агародамі да 2370 га, бульбай і караньплодамі—1139 га, збожжавымі культурамі і тэхнічнымі травамі на зялёнае ўгнаньне—3991 га.

Але падрыхтоўчая праца да вясеньняй пасеўкампаніі і кіраўніцтва па лініі Менгарсавету недапушчальна слабое.

Гарсавет зусім мала зварочвае ўвагі на загатоўку насеннага фонду. Плян загатоўкі насеньня збожжавых культур і культурных траў выканан толькі на 50 проц. насеньня агародніны зусім не загатоўлена, бульбы на пасеньне загатоўлена нязначная колькасьць.

Плян загатоўкі штучнага ўгнаеньня выкананы толькі на 20 проц. збор попелу на ўгнаеньне організаваны дрэнна, жакты ссыпаюць попел у сьнег.

Слаба праводзіцца работа па колектывізацыі—організацыі новых колгасаў і прыліву ў старыя. Брыгадзіры цікавіліся, якія захады мяркуе ўжыць гарсавет, каб забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне вясеньняй пасеўкампаніі, організаваць новыя прыгарадныя гаспадаркі і забясьпечыць колгасы насеньнем і атрымалі адказ: „Гэта справа райколгасаюзу, ён і павінен клапаціцца аб насеньні і іншым“.

Прыгарадныя гаспадаркі не забясьпечаны рабочай і цягавай сілай. Цягавая сіла гэтых гаспадарак забясьпечвае іх толькі на 50 проц. Кіраўнікі-ж з гарсавету, спадзяючыся на тое, што для прыгарадных гаспадарак мяркуецца завезьці 10 трактароў, зусім не клапоцяцца аб цягавай сіле для колгасаў.

Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўкампаніі ідзе нездавальняюча. Колгасы не распачалі ачыстку насеньня і рамонт сельска-гаспадарчых машын. Шэфскія організацыі не пераключылі сваёй працы на дапамогу колгасам. Узьнятае газэтай „Рабочий“ пытаньне аб тым, каб паасобныя прыгарадныя гаспадаркі прымацаваць да фабрык і заводаў, ЦСПСБ і Гарсавет ня ажыцьцяўляюць.

15 сельсаветаў без кіраўніцтва

15 сельсаветаў пасьля рэорганізацыі раёнаў далучаны да Менгарсавету. Але сельска-гаспадарчы сэктар гарсавету ня кіруе імі. Гарсавет ня ведае, што ў гэтых сельсаветах робіцца па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы.

Вышэйпрыведзеныя факты з усей яскравасьцю сьведчаць аб безадказных адносінах кіраўніцтва Менгарсавету да выкананьня дырэктывы партыі і ўраду аб падрыхтоўцы да вясеньняй пасеўкампаніі і організацыі прыгарадных гаспадарак для рабочага забясьпечэньня. Бязьдзейнасьць Менгарсавету ставіць пад пагрозу пасьпяховае правядзеньне вясеньняй пасеўкампаніі, організацыю колгаснага прыліву і разьвіцьцё прыгарадных гаспадарак

Гарком партыі павінен праверыць, як Менгарсавет выконвае дырэктывы партыі і прыняць адпаведныя меры да тых, хто зрывае іх ажыцьцяўленьне.

Брыгада „Ч. З.“ і курсаў КСМ актыву. Ш, М, і Л.

ЛЕПШЫЯ ЎЗОРЫ ОПОРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКІ


Ліст з Вульскага раёну

Вульскі райколгассаюз і Райза не сьпяшаюцца з падрыхтоўчай работай да вясеньняй пасеўкампаніі. Ужо сёньня ва ўсю шырыню сказваецца махровейшы опортунізм на галоўных фронтах падрыхтоўкі да вясны: колектывізацыі, збору насенных і страхавых фондаў, рамонту машын і г. д.

Каб ня быць галаслоўнымі пяройдзем да фактаў.

Самацёк у колгасным будаўніцтве

За асеньнюю пасеўкампанію 1930 г. ў раёне організавана 22 новыя колгасы, але ніхто ня думае



Ня шкодзіла-б і яго праз трыер прапусьціць

аб іх замацаваньні. Два колгасы ўжо разваліліся.

Здаволіўшыся посьпехамі колектывізацыі за асеньні час, раённыя організацыі зусім закінулі работу па далейшай колектывізацыі.

Перавыбары сельсаветаў, якія нядаўна адбыліся, не скарыстаны для ўздыму новай колгаснай хвалі. За ўвесь час **не організавана ніводнага колгасу.**

4 сельсаветы раёну падыходзяць ужо да суцэльнай колектывізацыі (колектывізавана 40—70 проц. гаспадарак), а такія сельсаветы, як Вобальскі, Клетчынскі, Аранкаўскі і Мішкавіцкі, колектывізаваны толькі на 2—3 проц. У чатырох колгасах („Комунар“, „Нізгалава“, „Сілач“ і „Магутны“) з-за галавацяпства райколгассаюзу яшчэ не праведзена разьмеркаваньне ўраджаю.

Паўнейшы правал у падрыхтоўцы да вясны

Заданьне ўраду: „закончыць стварэньне насенных і страхавых фондаў у колгасах і паасобным сэктары не пазьней 1-га лютага“ ў Вульскім раёне ня выканана.

22 новаорганізаваныя колгасы не ўтварылі і не абагулілі насенных фондаў.

Да ачысткі насеньня яшчэ не прыступалі. Машыны для ачысткі збожжа не адрамантаваны.

Нядаўна быў такі выпадак. Сяляне Баранькаўскага сельсавету прывезьлі ў Вульскі аграпункт насеньне для ачысткі, але пункт аказаўся на замку.

Сялянам прышлося вярнуцца дамоў не ачысьціўшы насеньня.

Па лініі Белкоопсаюзу і Наркомгандлю дана заданьне Райкоопсаюзу і Райснажыв. таварыству загатовіць 250 тон насенных траў і 3 тоны агароднага **насеньня, але** загатоўка **яшчэ не распачалася.** Плян загатавак не даведзены да сельсаветаў і вёсак.

Ня лепш справа з плянамі пасеўкампаніі. Яны толькі **гэтымі днямі накіраваны ў сельсаветы.** Такім чынам сельсаветы не маглі яшчэ давесьці пляны да вёсак, колгасаў і паасобных гаспадароў.

Таксама яшчэ не распачата работа па складаньню вытворчых пляпаў у колгасах.

Наогул колгасы раёну, за малым выключэньнем, не разгарнулі падрыхтоўкі к вясьне.

Райколгассаюз ня прымае энэргічных мер, каб разгарнуць работу да вясеньняй пасеўкампаніі, а чакае пакуль Горацкая сельгас Акадэмія прышле студэнтаў.

Грамадзкасьць раёну не мобілізавала на выкананьне задач вясеньняй пасеўкампаніі.

Чужакі ў колгассаюзе

Склад работнікаў Райколгассаюзу не адпавядае задачам, якія стаяць перад колгаснай сыстэмай. Так, напрыклад, райаграном **Яўціхеева** пры зацьверджаньні раённага пасву пляну гаварыла: плян раздуты, нерэальны і ня будзе выкананы.

Аграном райколгассаюзу **Ягораў**—былы белагвардзейскі афіцэр, якога мінулай вясною выгналі з Лепельскага раёну, вядзе шкодніцкую работу.

На організацыі першапачатковых таварыстваў працуе зняты па чыстцы савецкага апарату сын заможніка—п'яніца **Сарокін.**

Яго работу можна бачыць ужо ў тым, што ў раёне ўсяго толькі 5 першапачатковых таварыстваў, організацыя новых не праводзіцца.

Райколгассаюз ня думае аб падрыхтоўцы кадраў. Нядаўна сабраныя курсы рахунказодаў распушчаны.

Мы сыгналізуем: — падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны зрываецца, грамадзкія організацыі не мобілізаваны для разгортваньня падрыхтоўкі.

Комсамольская організацыя яшчэ нават не распрацавала гэтага пытаньня.

Профсаюзы зусім бязьдзейнічаюць.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па гэтых фактах опортуністычнай бязьдзейнасьці і як сьлед, па-бальшавіцку, узяцца за падрыхтоўку да пасеўкампаніі.

А. Усьмінскі.

БУДЗЬ ГАТОВЫМ СТАЦЬ ПАД РУЖЖО!

За 100 проц. ваенізацыю комсамолу

Важнейшымі пытаньнямі ўсёй нашай гістарычнай работы зьяўляюцца пытаньні абароны адзінага ў сьвеце Савецкага Саюзу—бацькаўшчыну ўсх працоўных і прыгнечаных народаў.

IX-ты зьезд Усе ЛКСМ па дакладу тав. Кагановіча пастанавіў:

„Зьезд даручае ЦК УсеЛКСМ забясьпечыць усе неабходныя меры для больш шырокага ўдзелу саюзу ў справе ўмацаваньня абароназдольнасьці СССР і асабліва ў справе дапамогі мужнай Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і Чырвонаму марскаму і паветранаму флётам. Зьезд лічыць немагчымым прабываньне ў шэрагах УсеЛКСМ людзей, якія недаацэньваюць вайсковай небясьпекі, не праходзяць вайсковай вучобы, не падрыхтоўваюцца да надыходзячых боек“. Гэта рашэньне зьезду павінна быць неадкладна ператворана ў жыцьцё.

Комсамол з 25 студзеня—шэф паветранага флёту. Гэта шэфства абавязвае нас і накладае адказнасьць за падрыхтоўку комсамольцаў-лётнікаў, комсамольцаў, уладаючых абаронай краіны ня толькі на зямлі, але і ў паветры. Лёзунг: „Комсамол—на самалёт“ патрабуе вялікай увагі асабліва беларускай організацыі, як організацыі прымежнай рэспублікі.

У адзнаку XIII-гадавіны РСЧА і азнаймаваньне нашай работы над шэфствам павінна зьявіцца масавая мобілізацыя комсамольцаў і рабочае моладзі ва ўдарныя ваенізаваныя брыгады імя 13-й гадавіны РСЧА, імя Кліма Варашылава. Трэба будзе на прадпрыемствах, у колгасах саўгасах, на чыгунцы правесьці ваенізаваныя зьлёты і мітынгі. Гэтыя мерапрыемствы павінны быць прасякнуты практычнай рэалізацыяй прынятых партыяй і саюзам пастаноў.

Няма месца ў комсамоле тым, хто ня рыхтуецца да будучай клясавай вайны.

Уперад—за шырокую масавую ваенізацыю, за скачэньне да тэрміну абавязковага вайсковага навучаньня, за меткую стральбу, за тактычныя выхады, манэўры, павышэньне абароназдольнасьці СССР.

Гузікаў

З пастановы бюро Менскага Гаркому ЛКСМБ ад 30-I-31 г. аб сьвяткаваньні 50-годзьдзя т. Варашылава

Становішча ваенізацыі шэрагаў комсамолу і рабоча-сялянскай моладзі Менскай організацыі яўна нездавальняючае, аб чым сьведчыць вайсковая няпісьменнасьць значнай часткі організацыі, надзвычайна малая ўвага да пытаньняў працы організацыі Асоавіяхэму, пасылкі лепшых ударнікаў у вайсковыя школы, невыкананьне пастановы ЦК аб абавязковым вайсковым навучаньні адсутнасьць вайсковых куткоў у большасьці ячэек.

Надыходзячая 13 гадавіна Чырвонай арміі, 50-годзьдзе т. Варашылава, пастанова IX усесаюзнага зьезду аб узяцьці шэфства комсамолу над вайскова-паветранымі сіламі Чырвонай арміі яшчэ больш абавязваюць нашу організацыю пераключыцца на справу хутчэйшага наладжваньня вайсковай працы ЛКСМ, дзеля гэтага бюро Гаркому ЛКСМБ пастанаўляе:

1. 5-II-31 г. правесьці вечар гарадзкой комсамольскай організацыі супольна з рабочай моладзьдзю і сутаварыскімі чырвонаармейскімі часткамі, з наступнымі пітаньнямі:

1. 50-годзьдзе Варашылава і яго дзейнасьць; задачы комсамолу ў справе яго ваенізацыі на падставе рашэньняў IX і X зьездаў КСМ.

2. Правесьці мітынгі па вытворчых колектывах па пытаньням 50-годзьдзя Варашылава і чарговых задач КСМ у справе военізацыі, асабліва завастрыў пытаньне аб налажваньні ўсеагульнага вайсковага навучаньня, аб удзеле КСМ у працы Асоавіахэму, зьвязваючы іх з організацыяй груп маладых энтузіястых-варашылаўцаў.

Прапанаваць вайсковаму сэктару забясьпечыць ячэйкі належным кадрам пропагандыстых па гэтаму пытаньню;

3. На працягу 5-дзён правесьці вечары вытворчых, колгасных і вясковых ячэек супольна з чырвонаармейскімі сутаварыскімі часткамі, прысьвечаныя 50-годзьдзю Варашылава з пункту погляду далейшага павароту організацыі да гаспадарчых задач і баявой падрыхтоўкі;

4. Уся гэта праца павінна быць зьвязана з канчатковым наладжваньнем вайсковага абавязковага навучаньня, удзелам у працы Асоавіяхэму, вярбоўкаю лепшых ударнікаў з рабочае моладзі, с.-г. рабочай моладзі, батракоў, беднякоў, колгасьнікаў. Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на вярбоўку ў школы АБВШ, вайскова-паветраных сіл і інш. тэхнічна-вайсковыя школы;

5. Распачаць збор сродкаў сярод комсамольцаў, усёй рабоча-сялянскай моладзі, дарослых рабочых і сялян у жалезны фонд абароны СССР, на пабудову самалётаў імя IX і X зьездаў і падводнай лодкі. Збор сродкаў закончыць да 21-II

6. Разам з гэтым бюро Гаркому абавязвае ўсю організацыю распачаць працу па падпісцы на вайсковыя газэты і часопісы;

7. Каб сапраўды наладзіць вайсковую вучобу ў комсамоле, павярнуць організацыю тварам да актыўнага ўдзелу ў Асоавіяхэме, палепшыць працу па сутаварыству з Чырвонай арміяй. рэалізаваць адозвы IX зьезду, бюро гаркамолу абвяшчае з 15 па 21 лютага тыдзень ліквідацыі прарываў у вайсковай працы ячэек. Увесь тыдзень комсамольскія організацыі павінны скарыстаць для таго, каб наладзіць працу вайсковых гурткоў, вербаваць моладзь у вайсковыя школы, на 100 проц. ахапіць Асоавіяхэмам і правесьці падрыхтоўку да вайсковага паходу.

8. 21-II правесьці вайсковы паход Менскай організацыі комсамолу супольна з рабочай моладзьдзю: для падрыхтоўкі і кіраўніцтва вайсковым паходам склацьці штаб. Падбор пэрсанальнага складу даручыць вайсковаму сэктару.

Дарэмная здача хлеба—на абароназдольнасьць краіны

КОЙДАНАВА, 31 (Па тэлефону ад нашага спэцкора). Сёньня раніцою амаль з усіх сельсаветаў прыбылі чырвоныя абозы з жытам, бульбай, мясам, лёнам ад колгасьнікаў і аднаасобнікаў. Паміж сотень падвод са збожжам ёсьць асобны абоз—дарэмная здача хлеба на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны і Чырвонай арміі.

Учора дэлегаты зьезду заслухалі даклад тав. Гурыновіча аб рабоце ўраду БССР.

Юдвянкоў

ПОЛІЦЭЙСКІМ КОРДОНАМ НЕ ПЕРАГАРАДЗІЦЬ ДАРОГУ РЭВОЛЮЦЫЙНАМУ ПРОЛЕТАРЫЯТУ

Рэволюцыйны рух у Польшы ўзрастае

Варшава, 30. Наступленьне Верхня-Сілескіх прамыслоўцаў, зачыненьне раду прадпрыемстваў і масавае звальненьне рабочых, узмацняючы да крайнасьці ўбоства і беспрацоўе, прывялі адначасова да нябывалага абвостраньня клясавых і соцыяльных боек і аграмаднага ўздыму рэволюцыйнай актыўнасьці рабочых мас.

На чале нарастаючага руху супроць наступаючага капіталу, у першаю чаргу, сталі левыя рэволюцыйныя профсаюзы, якія разгарнулі масавую агітацыйную і організацыйную кампанію ў абарону інтарэсаў Верхня-Сілескага пролетарыяту. На прадпрыемствах адбылася вялікая колькасьць забастовак, мітынгаў і дэмонстрацый, пры чым увесь буржуазны друк указвае на вялікі размах кампаніі. Нават урадавая трацэйская камісія не адважылася пад націскам мас зьменшыць зарплату, чаго патрабавалі шахтаўласьнікі.

Рэволюцыйны рух рабочых прымае цяпер асабліва напружаны характар.

Беспрацоўныя патрабуюць выплаты пэнсіі

Варшава, 30. У Плоцку беспрацоўныя яўрэйскія рабочыя сабраліся ў вялікай колькасьці каля яўрэйскай супольі, патрабуючы выплаты пэнсіі. Атрымаўшы адмову, беспрацоўныя разграмілі памяшканьне суполкі.

Беспрацоўныя ў Польшчы паміраюць з голаду

Варшава. Беспрацоўе ў Польшы за апошні тыдзень узрасло на 18.392 чалавекі і дасягнула лічбы офіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных 321.540 чалавек. Дапамогу атрымліваюць толькі—10.000 беспрацоўных, рэшта літаральна памірае з голаду.

Пробная мобілізацыя прамысловасьці к вайне

ПРАГА, 26. Выходзячы ў Празе орган „Варгейт“ паведамляе, што францускі генэральны штаб робіць усеагульную праверку мобілізацыйнай гатоўнасьці прамысловасьці Францыі і Чэха-Славакіі. Нядаўна была праведзена пробная мобілізацыя разьмешчаных блізу Ліона фабрык штучнага шоўку. Фабрыкі на працягу 48 гадзін былі ператвораны ў заводы па загатоўцы выбуховых матэрый. Францускія прадпрыемствы Шнэйдэр-Крэзо завалены вялікімі заказамі на гранаты. У рабоце па масаваму вырабу гранат прыстасоўваюцца таксама аўтомобільныя заводы Сітроэна.

Газы супроць беспрацоўных і дзяцей

Варшава. У горадзе Хадзерж, у Пазнаньскім ваяводзтве, непадалёку ад нямецкай мяжы, 26 студзеня адбыліся выступленьні беспрацоўных. Значная колькасьць беспрацоўных сабралася каля магістрату, патрабуючы дапамогі. Жонкі і дзеці беспрацоўных накіраваліся да старасты і паслалі да яго дэлегацыю для перагавораў.

Староста адмовіўся прыняць дэлегацыю і аддаў загад разагнаць на тоўп. Поліцэйскія пусьцілі ў хо супроць дзяцей і жанчын шаблі, пры клады, газавыя і сьлёзатачывы бомбы.

Даведаўшыся аб гэтым, беспра цоўныя прышлі і сталі абараняц сваіх жонак і дзяцей. У час сутычк пацярпела 11 беспрацоўных, у ты ліку 78-гадовы старык. Арыштава 8 чалавек.

90 процантаў хворых дзяцей

Нядаўна ў горадзе Будапэшце (сталіца Вэнгрыі) па пачыну мясцовай улады абследвалася становішча вучняў абшчынных школ. Матэр'ялы абсьледваньня даюць жудасны малюнак.

З 70 тысяч дзяцей 90% хворыя, альбо церпяць ад якіх-небудзь фізычных недахопаў. Амаль чацьвёртая частка вучняў знаходзіцца бяз догляду, бо іх бацькі ўвесь дзень праводзяць на рабоце. Адна трэцяя частка школьнікаў харчуецца амаль выключна сухім хлебам. Звыш паловы дзяцей п'юць віно і гарэлку. Большасьць дзяцей ня маюць цёплай вопраткі.

Само сабою зразумела, што аўтары гэтай справаздачы не змаглі намс ціць якіх-колечы рашучых захада для дапамогі дзецям пролетарыяту „Грамадзкасьць“ Будапэшту ня та даўно імкнулася „дапамагчы бедны дзецям“, але адно, што ёй удалос зрабіць, гэта... паслаць 87 дзяце для папраўкі на вёску.

Няма чаго казаць, што падобны дабрачынныя меры не дапамогуц вырашыць пытаньня аб дзіцячай патрэбе.

Ні адзін комсамолец не абраны

Перавыбарчая кампанія Гомельскага гарсавету прашла без актыўнага ўдзелу комсамольскай організацыі заводу „Рухавік Рэволюцыі“

За ўвесь час гэта пытаньне не стаяла на сходзе ячэйкі ЛКСМБ. Ня было праведзена ніякай растлумачальнай працы як сярод комсамольцаў, так і рабочай моладзі. Комсамольцы не змагаліся за 100 проц. яўку на справаздачна-перавыбарчыя сходы.

Завадзкая насьценгазэта „Арфа“ абмежавалася адным артыкулам аб перавыбарах гарсавету, а насьценгазэта ФЗВ прашла міма гэтай важнейшай політычнай кампаніі

У выніку ўсяго гэтага ня был поўнай яўкі на справаздачна-пера выбарчыя сходы гарсавету, адчува лася неразуменьне паасобнымі ком самольцамі політычнай сутнасьц перавыбараў. Ні адзін комсамолец н абраны ў гарсавет.

Гарком комсамолу павінен зацікавіцца становішчам ячэйкі і я дзейнасьцю ў галіне ажыцьцяўленьн важнейшых задач, пастаўленых партыяй.

С. Мельнікаў.

Пакласьці канец бясплянавасьці

Аднэй з найбольш масавых організацый, якая павінна організоўваць творчую ініцыятыву мас студэнтаў, зьяўляецца профком. Аднак работа профкома Музтэхнікума не адпавядае тым запатрабаваньням, якія высоўваюцца шпаркім ростам соцыялістычнага будаўніцтва нашай краіны. Гора-кіраўнікі профкому Музтэхнікуму бяруць стаўку на самацёк, у рабоце пануе бяссыстэмнасьць і бясплянавасьць. Партыйная і комсамольскія ячэйкі работай профкому ня кіруюць. Неабходна тэрміно зрабіць агляд становішча работ грамадзкіх організацый тэхнікуму мобілізаваўшы шырокія масы сту дэнтаў на ўзмацненьне работы проф кому, падпарадкаваўшы яе ўзрас таючым тэмпам соцыялістычнага нацыянальна-культурнага будаўніцт ва.

Юнкор Л.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—
РЭДКОЛЕГІЯ

Згублены

— Сяброўскі біл. за № 154142, на імя Гутмана А. Л., выд. ЦП саюзу Гарбароў.

— Комсам. білет за № 100997, на імя Галовы М., выд. Вузьдзенск. РК КСМ.

— Вайсковы білет, на імя Гвазьдзёва М. Ф., выд. Мен. Акрваенкоматам.

— Пасьвед. на імя Венчыка Б., выд. Мен. профшколай.

— Комсам. білет за № 120386, на імя Бамоаса Т. Г., выд. Мен. АК ЛКСМБ.

— Пасьведч. на імя Гольдбэрга М. Н., выд. аб'ядн. профшколай.

— Вайсковы білет, вучотная карт на каня, выд. Асов. с-с на імя Ма шчыца Ц:

— Комсам. білет за № 55796, на імя Гука Т. П., выд. Мен. АК ЛКСМБ

— Вайсковы білет на імя Ніконча ка М. П., выд. Чэрвен. РВК.

— Комсам. білет на імя Марозава Я. А., выд. Шклоўскім РК КСМ.

— Комсам. білет за № 98063, на ім Ніканчыка М. П., выд. Чэрвен. Р КСМ.

— Комсам. білет за № 94223, на ім Шайкава Р. Т., выд. Аршанскім Р КСМ.

— Білет саюзу Працасьветы на ім Ніканчыка М. П., выд. Чэрвеньскі СПА.

— Комсам. білет за № 94309 на ім Шпунта Я. М., выд. Аршанскім Р ЛКСМБ.

— Комсам. білет за № 82625, на імя Бондара Р. М., выд. Скрыгал. Р ЛКСМБ.

— Профшкольскі білет на імя Шпун та Я. М., выд. Аб'ядн. профшколай.

— Комсам. білет за № 133893, на імя Лайхтмана А., выд. Лельчыцкім РК ЛКСМБ.

— Комсам. білет за № 152251, на імя Багдановіча М. Я., выд. Магілеўскім РК ЛКСМБ.

— Комсам. білет за № 6600, на імя Леньніка, выд. Слуцкім РК ЛКСМБ

— Комсам. білет за № 122334, на імя Барысёнка Н. Я., выд Сьвіслацк РК ЛКСМБ.

— Комсам. білет за № 9960, на імя Эрблат. Л. А., выд. Полацкім РК ЛКСМБ.

— Воінскі біл. на імя Рудакоўскага Я. Я., выд. Жыткавіцкім РВК.

Агульна-гарадзкая конфэрэнцыя „лёгкай кавалерыі“

6 лютага 1931 г., а 6-ай гадзіне ўвечары, у памяшканьні дому Працасьветы склікаецца агульна-гарадзкая конфэрэнцыя „лёгкай кавалерыі“ г. Менску з наступным парадкам дня: Аб выніках X-га зьезду ЛКСМБ і IX УсеЛКСМ і задачах „ЛК“, выбары горштабу „ЛК“.

За час, які застаўся да конфэрэнцыі, усе атрады лёгкай кавалерыі павінны скласьці рапарты аб конкрэтнай працы, якую правяла лёгкая кавалерыя, і даслаць у Гарком ЛКСМБ у Орг. Камісію не пазьней 3-II-31 г.

Норма выбару на конфэрэнцыю: ад 5 лёгкіх кавалерыстых—1 дэлегат.

Мандаты атрымаць у Гаркоме ЛКСМБ не пазьней 4-II-31 г.

Орг. камісія Мен. Гаркому ЛКСМБ.

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599